СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 121 (28231) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## СЭЗ «Магілёў» прымае інвестараў



## Анкалагі аб’ядноўваюцца



## Наш гімн у Парыжы

СТАР. 4

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Прыярытэты развіцця Беларусі на сярэднетэрміновую перспектыву выбраны абсалютна правільна. У нас добры патэнцыял — вытворчы, кадравы, у нас добрая інфраструктура, сацыяльна-палітычнае становішча, у нас ёсць стабільнасць, упэўненасць людзей у тым, што рашэнні, якія прымаюцца, правільныя. Мы вызначылі чарговыя напрамкі развіцця на пяцігоддзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20036,00 | ▼ |
| Еўра | 22161,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 308,06 | ▲ |
| Укр. грыўня | 809,96 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ПАД КРЫЛОМ «БЕРАГІНІ»

## У пасёлку Акцябрскі прайшоў IX Рэспубліканскі фестываль




Фота БЕЛТА.

**Кажуць, што «Берагіня» — фестываль незвычайны: кожны, хто хоць раз завітае ў гэтыя дні ў Акцябрскі і акунецца ў непаўторную атмасферу свята, абавязкова вернецца наступны раз. Але калі задумацца, то ў гэтай адметнасці нічога дзіўнага: на чатыры дні невялічкае мястэчка на Гомельшчыне ператвараецца ў сапраўдную сталіцу фальклору: сюды прыязджаюць гурты, танцавальныя пары з усёй Беларусі і нават замежжа. Сёлетняе свята падтрымалі Міністэрства культуры Беларусі, Гомельскі аблвыканкам, Акцябрскі райвыканкам, Беларускі фонд культуры; яно ўпершыню прайшло пад патранатам ЮНЕСКА і Канвенцыі па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У фестывалі прынялі ўдзел каля 900 спевакоў, музыкаў з Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы, Чэхіі, Сербіі, а ў конкурсе танцавальных пар за званне найлепшых выканальнікаў беларускіх побытавых танцаў паспаборнічала каля 120 пар — гэта ў два разы больш, чым на мінулым фэсце.**

СТАР. 4

■ Мінус чатыры нулі

# ГРОШЫ. НОВЫЯ. І БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ

**Сапраўды, да грандыёзнай фінансавай нацыянальнай падзеі засталіся лічаныя дні. Ужо ў гэтую пятніцу (1 ліпеня) краіна пяройдзе на новыя грошы. Так, будзе праведзена дэнамінацыя і замест старых прывычных банкнотаў узору 2000 года мы пачнём атрымліваць новыя папяровыя грошы і манеты ўзору 2009 года.**

**Страшнавата? Згадзіцеся, што ёсць трошкі. Напрыклад, адна мая знаёмая нават перанесла свой адпачынак са жніўня на апошнюю дэкаду чэрвеня — першую палову ліпеня, каб сустрэць дэнамінацыю на фазэндзе, а разбірацца з нюансамі новых грошай вырашыла пазней. Пазіцыю маладой жанчыны часткова зразумець магчыма, але гэта не выйсце — хавацца ад такіх знакавых зменаў. Тым больш, што адпаведныя службы, ведамствы і, галоўнае, банкі абяцаюць нам пераход на новы маштаб грошай без праблем. Дакладней, з мінімальнымі нязручнасцямі ў першыя гадзіны (дні) ліпеня. Каб гэтыя самыя нязручнасці не сапсавалі нам жыццё, да іх трэба падрыхтавацца.**

**Больш за тое, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка неаднойчы падкрэсліваў, што Нацбанк і ўрад правялі грунтоўную работу, каб перайсці на новую валюту.**

**Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што дэнамінацыя, якая, магчыма, у нейкай ступені з'яўляецца непапулярным мерапрыемствам, праводзіцца напярэдадні палітычнай кампаніі — парламенцкіх выбараў. «Гэта сведчыць аб тым, што мы нікога не баімся, мы — дзяржаўныя людзі, а не толькі нейкія там палітыкі. А дзяржаўныя людзі заўсёды думаюць аб перспектывах, развіцці дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

СТАР. 2

■ Напярэдадні

# ГАЛОЎНАЕ ШЭСЦЕ КРАІНЫ

**Лічаныя дні застаюцца да галоўнага свята краіны. Адным з асноўных мерапрыемстваў святкавання Дня Незалежнасці па традыцыі стане парад. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на пляцы Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл, дзе кожны дзень чаканяць крок юныя сілавікі. Менавіта пешая калона па традыцыі распачне ўрачыстае шэсце, якое разгорнецца 3 ліпеня на адным з галоўных праспектаў сталіцы.**

СТАР. 3



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.